**ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА**

**на дысертацыю ГАРШКОВА АЛЯКСАНДРА ДЗМІТРЫЯВІЧА «Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія**

***Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасцям і галіне навукі, па якім яна прадстаўлена да абароны.*** Дысертацыя А.Д. Гаршкова «Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура» адпавядае заяўленай галіне навукі і спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія. Дысертацыя змяшчае вынікі палявых даследаванняў археалагічных помнікаў, здзейсненых асабіста саіскальнікам, аўтарскія рашэнні ў галіне методыкі і практыкі камеральна-лабараторнай апрацоўкі матэрыялаў, а таксама гістарычную характарыстыку аднаго са складнікаў насельніцтва вылучанага рэгіёна перыяду фінальнага палеаліту, здзейсненай па выніках комплекснага аналітычнага вывучэння археалагічных матэрыялаў згаданай культуры броме, як у рэгіянальным, так і ў агульнаеўрапейскім кантэксце.

***Актуальнасць тэмы дысертацыі*** абумоўлена неабходнасцю выканання максімальна поўнай і паслядоўнай характарыстыкі этапу ранняга засваення прыйшлым насельніцтвам тэрыторыі Беларусі, якое адбывалася ў познеледавіковы перыяд. У прыватнасці, вартая ўдакладнення сітуацыя ў заходнім-паўднёва-заходнім рэгіёне, вылучаным саіскальнікам, дзе раней даследчыкамі адзначалася прысутнасць носьбітаў культуры броме, але мэтавага вывучэння самой культуры дагэтуль не здзяйснялася. Асаблівую значнасць для даследавання прадстаўленасці культуры броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана ўяўляе разгляд яе рэгіянальных праяў на агульнаеўрапейскім фоне, у суадносінах з мацярынскім арэалам, а таксама з іншымі перыферыйнымі напрамкамі яе распаўсюджання.

***Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, палажэнняў, якія выносяцца на абарону*** вызначаецца тым, што прадстаўленая дысертацыя з’яўляецца першым у айчыннай, а таксама ў замежнай гістарыяграфіі мэтавым комплексным даследаваннем археалагічнай культуры броме ў арэале зыходнага рассялення і гаспадарання яе носьбітаў на тэрыторыі Беларусі (заходні-паўднёва-заходні рэгіён: міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана). У рабоце ўпершыню раскрываюцца прычыны гэтага рассялення ў рэгіёне, ахарактарызаваны працэс, храналогія і напрамкі рассялення з мацярынскага арэалу, грунтоўна ўдакладнены змест і параметры жыццядзейнасці носьбітаў культуры броме. Аўтар істотна, больш чым удвая, пашырыў крыніцавую базу па тэме, здзейсніў ідэнтыфікацыю, характарыстыку і ўвядзенне ў навуковы зварот матэрыялаў з 18 новых помнікаў, звязаных з культурай броме. Таксама, саіскальнік асабіста

праводзіў палявыя даследаванні 6 помнікаў археалогіі перыяду палеаліту, з якіх 3 належаць уласна культуры броме, выканаў комплексную апрацоўку іх матэрыялаў, і ўвядзенне ў навуковы зварот. Пры тым аўтарам зроблены абгрунтаваныя прапановы па ўдасканаленню методыкі раскопак, у адпаведнасці са спецыфічнай планіграфіяй помнікаў культуры броме ў рэгіёне.

Варта падкрэсліць, што высокая эфектыўнасць вывучэння згаданай археалагічнай культуры і атрыманне прынцыпова новых навуковых вынікаў дасягнута аўтарам праз кваліфікаваны выбар і трапнае ўжыванне абшырнага комплексу інструментальна-метадычных сродкаў, са спецыялізаванай праграмна-кампутарнай апрацоўкай вынікаў здымак і вымярэнняў, у тым ліку: метады даследавання артэфактаў – тэхніка-марфалагічны, метад карэляцыі колькасных паказчыкаў і TSCA, рэканструкцыі  і палявых эксперыментаў, у тым ліку – вызначэнне функцыянальнай прыналежнасці кідальнага ўзбраення, піраметрычны аналіз і рэмантаж крамянёвых вырабаў; метады даследавання помнікаў – LIDAR-здымкі, аналіз карт рэльефу STRM, геаграфічная лакалізацыя і картаграфаванне (у сістэме каардынат WGS 84), вывучэнне тапаграфіі, стратыграфіі, мікрастратыграфіі, грануламетрычнага аналізу глебы, планіграфіі і 3D-фіксацыі  артэфактаў (з выкарыстаннем тахеометра і GPS-трэкера), вызначэнне спецыялізацыі стаянак на падставе класіфікацыі С. Андэрсэна (Данія), метад аналогій у палеаэканамічных рэканструкцыях помнікаў, паліналагічны аналіз і вывучэнне спорава-пыльцовых спектраў; метады датавання – радыёвугляродны і OSL, тэрмалюмінісцэнцыі, метад каліброўкі (па праграме OxCal) радыёвугляродных датыровак з мэтай карэляцыі з данымі прыродазнаўчых навук. Высокую каштоўнасць і навізну мае гістарыяграфічная распрацоўка па тэме, якая змяшчае вынікі навейшых навуковых работ айчынных і замежных аўтараў.

Вывучэнне існавання культуры броме на тэрыторыі Беларусі дагэтуль насіла фрагментаваны характар. Прадстаўленая работа ліквідуе гэты прагал, і ўпершыню прадстаўляе цэласную карціну, ад этапу фарміравання культуры, да этапу першаснага рассялення на тэрыторыі Беларусі і засваення адпаведнага рэгіёну.

Палажэнні, якія выносяцца на абарону, сфармуляваны карэктна і змястоўна, утрымліваюць новыя навуковыя вынікі, якія належным чынам абгрунтаваныя саіскальнікам у тэксце дысертацыі і навуковых публікацыях.

Навізна і значнасць атрыманых вынікаў сцвярджаецца трыма актамі ўкаранення вынікаў дысертацыйнага даследавання: у археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (акт № 1 ад 25.09.2023); для стварэння экскурсій Гродзенскім абласным цэнтрам турызму і краязнаўства (акт № 1 ад 27.09.2023); пры распрацоўцы вучэбных праграм па курсах “Археалогія”, “Гісторыя першабытнага грамадства” для студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы спецыяльнасці “Гісторыя” (акт № 03-0/047 ад 18.10.2023).

***Абгрунтаванасць і даставернасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі*** вызначаецца строгім навуковым падыходам аўтара, які заснаваны на комплексным аналізе крыніцавага матэрыялу, пераважна, археалагічных даных фінальнага палеаліту; грунтуецца на асноватворных прынцыпах гістарычнага даследавання: аб'ектыўнасць, гістарызм, сістэмнасць, каштоўнасны падыход, на выкарыстанні агульнанавуковых і шырокага кола спецыяльна-гістарычных метадаў; абапіраецца на значную, рэпрэзентатыўную колькасць археалагічных крыніц (апрацаваны 70 тысяч знаходак з 48 помнікаў, з якіх болей 40 тысяч належаць культуры броме) і дастатковы аб'ем навуковай літаратуры (311 пазіцый, з якіх амаль палова – замежныя выданні, а таксама 27 – аўтарскія), уключаючы справаздачы археалагічных экспедыцый. У Дадатках да дысертацыі прадстаўлены змястоўныя ілюстрацыйныя, картаграфічныя і таблічныя матэрыялы.

Высновы даследчыка грунтуюцца на паўнаважкім крыніцавым і гістарыяграфічным падмурку, пераканаўча аргументуюцца тэкстам працы. Магчыма сцвярджаць, што распрацаваная А.Д. Гаршковым характарыстыка культуры броме дасканала падрыхтаваная і з'яўляецца істотным укладам у гістарычную навуку.

***Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі.*** Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі ўвасоблена ў тым, што задзейнічаныя і ўведзеныя аўтарам у навуковы зварот крыніцы, распрацаваныя гістарыяграфічныя вызначэнні, навуковыя высновы могуць быць выкарыстаныя ў наступных навуковых даследаваннях шэрагу новых праблем ранняга перыяду айчыннай гісторыі, у метадалагічных распрацоўках, падчас падрыхтоўкі навуковых манаграфій.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыі ў тым, што навуковыя падыходы і высновы аўтара могуць быць выкарыстаныя як метадалагічная аснова вывучэння новых помнікаў фінальнага палеаліту; атрыманыя вынікі вартыя адлюстравання ў падручніках і вучэбных дапаможніках у навуковых установах Беларусі і замежжа; для стварэння навуковых музейных экспазіцый і распрацоўкі турыстычных маршрутаў.

Сацыяльная значнасць вынікаў даследавання: выяўленыя і апрацаваныя аўтарам матэрыялы карысныя для ўжывання ў работах па папулярызацыі падзей айчыннай гісторыі, работ навуковых устаноў, асабістых дасягненняў навукоўцаў, у тым ліку для падрыхтоўкі сцэнарыяў медыйных навукова-асветніцкіх твораў.

Эканамічная значнасць вынікаў дысертацыі: матэрыялы дадзенага дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаныя падчас падрыхтоўкі міжнародных даследчых праектаў.

***Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.*** Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі апрабіраваны аўтарам падчас дакладаў на 20 навуковых канферэнцыях і круглых сталах, з якіх 11 міжнародныя

канферэнцыі. Крыніцавы матэрыял, вынікі аналітычных даследаванняў і палажэнні, якія выносяцца на абарону выкладзены саіскальнікам ў 27 навуковых публікацыях (без сааўтараў – 24, замежныя – 2), з якіх 10 артыкулаў прадстаўлены ў выданнях, якія ўваходзяць у "Пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў".

***Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.*** Дысертацыя прадстаўлена ў двух кнігах, з якіх адна – уласна тэкст дысертацыі, і другая – дадаткі. Работа аформлена згодна патрабаванням, якія прад'яўляюцца ВАК Рэспублікі Беларусь (далей – РБ). Структура тэкста дысертацыі уключае: тытульны аркуш, змест, спіс скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, уводзіны, агульную характарыстыку работы, 4 главы з высновамі ў канцы кожнай главы, заключэнне, якое змяшчае рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў даследавання, спіс крыніц і літаратуры, уключаючы асабістыя публікацыі саіскальніка. Другая кніга змяшчае 5 дадаткаў. Тэксты дысертацыі і аўтарэферата выкладзены нарматыўнай беларускай мовай, у адпаведнасці з патрабаваннямі Інструкцыі ВАК РБ па афармленню дысертацыі і аўтарэферата.

Аўтарэферат цалкам адпавядае зместу дысертацыі, адлюстроўвае яе структуру, логіку разважанняў і аргументацыю аўтара, уключае вывады і палажэнні, якія выносяцца на абарону.

***Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.*** Аналіз зместу дысертацыі А.Д. Гаршкова, сукупнасці навуковых і практычных вынікаў работы сведчыць аб высокай навуковай кваліфікацыі аўтара. Дысертацыя адпавядае дзейнічаючаму Палажэнню ВАК РБ аб прысуджэнні вучоных ступеняў. Узровень навуковай падрыхтоўкі А.Д. Гаршова адпавядае кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук і заяўленай спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія.

***Недахопы і заўвагі па дысертацыі.*** Варта адзначыць лагічны, стуктурна прадуманы план дысертацыі, узважаную аргументацыю навуковых палажэнняў, выкладзеных саіскальнікам, іх доказнасць і дакладнасць. Побач з тым, маюцца асобныя заўвагі:

– па афармленні: – на с. 44 дысертацыі, 1 абзац зверху, прапушчаная літара “н” (у слове "трансфармаваўся"); – на с. 44 дысертацыі, 2 абзац зверху – пераблытаны месцамі літары “ы” і “а” у слове “падыход”; – на с. 46 дысертацыі, 1 абзац зверху – згадваецца уплыў вывяржэння вулкана Лах, пры тым у Дадатку Г прыведзена красамоўная рэканструкцыя розы вятроў гэтай падзеі. На жаль, у тэксце дысертацыі няма спасылкі на гэты малюнак (мал. Г. 18, с. 71 Дадаткаў); – на с. 48 дысертацыі, 2 абзац зверху – прапушчыная словы "да н.э." (у датыроўцы перыяду); – на с. 48 дысертацыі, 2 абзац зверху, прапушчаная кропка (у датыроўцы перыяду); – на с. 49 дысертацыі, апошні абзац, прапушчаная літара "р" (у слове “дрыяса”); – на с. 51 дысертацыі, 2 абзац зверху – таўталогія з тэрмінам “формы”; – на с. 51

дысертацыі, 2 абзац знізу, перадапошні сказ утрымлівае недасканалы выраз; – на с. 58 дысертацыі, 3 абзац зверху, прапушчаная літара "й" (у слове "усёй"); – на с. 67 дысертацыі, 2 абзац знізу, памылкова ўведзена літара "г" замест "к" (у слове "пакладзеныя"); – на с. 84 дысертацыі, 2 абзац зверху, памылка ў слове "дадатковую"; – на с. 87 дысертацыі, 3 абзац знізу, стаіць залішні працяжнік паміж словамі "культурным" і "тыпам"; – на с. 87 дысертацыі, у спасылцы, прапушчаная літара "я" у слове "атрыманыя"; – на с. 90 дысертацыі, 2 абзац знізу, памылкова ўведзена слова "стады" (патрэбна "статкі"); – на с. 104 дысертацыі, 1 абзац зверху, памылкова ўведзена словы "ва ўсходняй" (патрэбна "у заходняй"); – на с. 109 дысертацыі, 3 абзац зверху, памылковая літара "я" ў слове "тэрыторый"; – у спісе выкарыстаных крыніц, па п. 42 (с. 118) адсутнічае год выдання; па п. 55 (с. 119) адсутнічае кропка пасля года выдання; па п. 96 (с. 123) і п. 224 (с. 133) не адзначана выдавецтва; у п. 207 (с. 132) напрыканцы прадрукаваны староннi тэкст; – у афармленні старонкі "змест" дысертацыі (с. 2) дарэчы было б уключыць спасылку на дадаткі; – у дадатку Г (Г1 – Г9) было б лагічным прывесці пералік адзначаных на картах помнікаў, як гэта зроблена аўтарам на карце Г5; – у афармленні загалоўкаў дадаткаў В, Д (с. 16, 200) у другой кнізе выкарыстаны адрозны ад іншых шрыфт; – загалоўкі карт Г8, Г9 вартыя ўдакладнення – у кнізе яны цалкам супадаюць, побач з іх розным зместам;

– па змесце: – на с. 44 дысертацыі, 2 абзац зверху – згаданы навуковыя пазіцыі даследчыкаў Г.В. Сініцынай і А.М. Сарокіна, але прыведзена спасылка толькі на публікацыю А.М. Сарокіна; – на с. 48 (2 абзац зверху) і с. 51 (3 абзац зверху) дысертацыі згадваецца такая адметная тэхналагічная рыса культуры броме, як рэсурсаёмістасць, але не прыводзіцца аргументацыя гэтай характарыстыкі, ці спасылка на работу ўласную альбо іншых навукоўцаў, ці спасылка на адпаведны раздзел дысертацыі (між тым, па тэксце дысертацыі ў главе 3 гэты тэзіс раскрываецца); – у высновах да 2 главы (с. 49) адзначаецца адметная асаблівасць культуры броме, адсутнасць укладышавага інвентару, але у тэксце самой главы гэта пытанне не раскрыта; – у п. 4 Заключэння, 1 абзац, 1 сказ – адзначана "існаванне" культуры броме, але па змесце мяркуецца правільна "прыход" альбо "засяленне".

Работа носіць комплексны характар, што добра аргументавана і рэалізавана аўтарам. Выкарыстанне спецыяльных даследчых метадаў увасабляе адзін з моцных бакоў даследавання, цалкам апраўдана і сцвярджаецца атрыманымі вынікамі. Адпаведныя спасылкі і каментарыі выкладзены ў тэксце дысертацыі. Між іншым, было б карысным абагуліць звесткі аб выкарыстаных метадычных рашэннях і прадставіць іх характарыстыку у спецыяльным раздзеле, напрыклад, у дадатку.

Падсумоўваючы, неабходна падкрэсліць станоўчае агульнае ўражанне ад прааналізаванай дысертацыі. Прыведзеныя заўвагі не ставяць пад сумненне саму дысертацыю, яе высновы, не носяць прынцыповага характару, з’яўляюцца рабочымі момантамі, і пры жаданні, саіскальнік можа іх ўлічыць ў далейшай сваёй працы.

***Высновы.*** На падставе выкладзенага магчыма засведчыць, што дысертацыйнае даследаванне А.Д. Гаршкова «Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура» з'яўляецца паўнаважкай, самастойна выкананай кваліфікацыйнай навуковай працай, якая адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь.

Дысертацыя прысвечана вывучэнню культуры броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана, выяўленню асаблівасцяў яе развіцця. Саіскальнікам разгледжаны геолага-ландшафтныя і прыродна-кліматычныя умовы, на фоне якіх складвалася і бытавала згаданая культура; праведзены разгорнутыя навуковыя даследаванні і распрацоўкі па тэме, у т.л. – крыніцазнаўчыя, гістарыяграфічныя, метадалагічныя, археалагічныя. Асноўная ўвага была засяроджана на вывучэнні матэрыяльнай культуры, на падставе чаго саіскальнікам прадстаўлены новыя крыніцы, факты і высновы па актуальнай навуковай праблеме ранняга засваення тэрыторыі Беларусі ў познеледавіковы перыяд. Дысертацыя змяшчае каштоўныя крыніцавыя і метадалагічныя матэрыялы, прынцыпова новую навуковую інфармацыю па археалогіі Беларусі, актуальную для наступных даследаванняў і практычнага ўкаранення.

У цэлым, прадстаўленая дысертацыйная праца А.Д. Гаршкова адпавядае патрабаванням ВАК РБ, якія прад'яўляюцца да дысертацыйных работ на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія.

Мяркую, што разгледжаная праца можа быць прынята ў якасці кандыдатскай дысертацыі, а яе аўтар, Аляксандр Дзмітрыевіч Гаршкоў, у адпаведнасці з п. 20 Палажэння ВАК РБ аб прысуджэнні вучоных ступеняў, заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук за новыя навуковыя і практычныя вынікі, у тым ліку за:

– выкананне рознабаковай, цэласнай характарыстыкі геолага-ландшафтных і прыродна-кліматычных умоў, суадносных з паходжаннем і бытаваннем археалагічнай культуры броме, на агульнаеўрапейскім фоне;

– ажыццяўленне комплекснага крыніцазнаўчага і гістарыяграфічнага даследавання вынікаў айчынных і замежных распрацовак па вывучэнні культуры броме, на падставе якіх здзейснена аргументаванае вызначэнне паходжання гэтай культуры, а таксама падстаў, шляхоў і тэрмінаў з'яўлення яе носьбітаў на тэрыторыі Беларусі, кірункаў яе далейшай эвалюцыі;

– істотнае пашырэнне крыніцавай базы па тэме культуры броме на тэрыторыі Беларусі, на падставе фарміравання і выкарыстання сучаснай комплекснай метадалагічнай асновы для апрацоўкі археалагічных матэрыялаў помнікаў фінальнага палеаліту ў рэгіёне; наступнага сістэмнага аналізу і абагульнення тых матэрыялаў; увядзення ў навуковы зварот абшырнага комплексу новых звестак аб гэтай культуры;

- здзяйсненне навукова абгрунтаванай характарыстыкі жыццядзейнасці носьбітаў культуры броме на тэрыторыі Беларусі, уключаючы храналогію і арэал рассялення; размяшчэнне, структуру і склад паселішчаў; формы, памеры і функцыянальнае прызначэнне збудаванняў; асноўны змест гаспадарчых заняткаў, іх матэрыяльнае і тэхналагічнае забеспячэнне.

Афіцыйны апанент,
намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі,
доктар гістарычных навук С.П. Віцязь

15 мая 2024 г.

ДЛЯ ДАКУМЕНТАЎ

ПОДПИСЬ С.П. Витязь
УДОСТОВЕРЯЮ
Ведущий специалист по кадрам
15. 05 2024 г.